УДК 339.543(09)(476)

**В. А. Астрога**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# МЕТРЫКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ МІНСКАЙ МЫТНІ

У артыкуле разглядаецца метрыка Вялікага Княства Літоўскага як унікальная і змястоўная крыніца для вывучэння гісторыі Мінскай мытні і мытнай гісторыі Беларусі адпаведнага гістарычнага перыяду. Дадзена характарыстыка дакументаў метрыкі, якія змяшчаюць інфармацыю пра «Меньскую мытную камору» – Мінскую мытню. Адзначана навуковая нявывучанасць праблемы метрыкі ВКЛ як крыніцы па беларускай мытнай гісторыі. Пазначаны найбольш важныя аспекты гісторыі мінскай мытні ў разнастайных дакументах метрыкі, пераважна «лістах» на арэнду мыта: умовы арэнды мытнай каморы, персаналіі кіраўнікоў Мінскай мытнай каморы, тэрміны і тэхналогіі збірання мыта, вызваленне ад уплаты мыта і бязмытныя лісты спагнання прамыта. Падкрэслена, што Літоўская метрыка можа стаць лексічным рэзервам для ўдасканальвання сучаснай беларускай мытнай тэрміналогіі. Зроблена выснова, што метрыка Вялікага Княства Літоўскага, нягледзячы на пэўную некамплектнасць дакументаў, з’яўляецца найбагацейшым зборам факталагічнага матарыялу па гісторыі мінскай мытні.

**Ключавыя словы:** гістарычная крыніца, Вялікае Княства Літоўскае, Беларусь, гісторыя мытнай справы, метрыка ВКЛ, ліст, мытная камора, мытня, мытнікі, мыта, прамыта.

**Для цытавання:** Астрога В. А. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага як крыніца па гісторыі Мінскай мытні // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 1 (269). С. 11–15. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-2.

**V. A. Astroha**
Belarusian state university

# METRICS OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA AS A SOURCE ON THE HISTORY OF MINSK CUSTOMS

The article considers the metric of the Grand Duchy of Lithuania as a unique and informative source for studying the history of the Minsk customs and the customs history of Belarus of the corresponding historical period. The characteristic of the metric documents containing information about the «Mensk customs storeroom» – Minsk customs is given. The scientific unexplored nature of the problem of the GDL metric as a source on the Belarusian customs history is noted. The most important aspects of the history of Minsk customs are indicated in various metrica documents, mainly «letters» for rent duties: terms of rent of the customs storeroom, personalities of the heads of the Minsk customs storeroom, terms and technologies of collection of duties, exemption from payment of duties and duty-free letters, promyt-smuggling. It is emphasized that the Lithuanian metric can become a lexical reserve for improving modern Belarusian customs terminology. It is concluded that the metric of the Grand Duchy of Lithuania, despite a certain incompleteness of documents, is the richest collection of factual material on the history of the Minsk customs.

**Keywords**: historical source, Grand Duchy of Lithuania, Belarus, history of customs, metric GDL, letter, customs storeroom, customs office, customs officers, myta-customs duty, promyta-smuggling.

**For citation:** Astroha V. A. Metrics of the Grand duchy of Lithuania as a source on the history of Minsk customs. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 1 (269), pp. 11–15 (In Belarusian). DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-2.

**Уводзіны.** Метрыка Вялікага Княства Літоўскага (Метрыка ВКЛ), ядро якога складалі беларускія землі, з’яўляецца вялізарнай крыніцай ведаў пра гісторыю нашай краіны. Літоўская метрыка, як найчасцей называецца гэты архіў канцэлярыі вялікага князя літоўскага XV–XVIII стст., – гэта адносна добра вядомы навукоўцам дакументальны комплекс. Нягледзячы на свой драматычны лёс, ён у дастаковай ступені захаваўся і выступае перманентнай крыніцай для мульціпрофільных даследаванняў па гісторыі Беларусі.

Трэба пазначыць, што ў ім даволі шмат утрымліваецца і звестак пра стан і развіццё мытнай справы на землях Вялікага Княства. Даследчыкі мытнай гісторыі Беларусі перыяду ВКЛ, у тым ліку Мінскай мытні, заўсёды выкарыстоўвалі гэтыя матэрыялы ў сваіх працах.

Сярод іх найбольш значнымі для беларускай гістарыяграфіі з’яўляюцца даследаванні М. В. Доўнар-Запольскага, які першы ў айчыннай гістарыяграфіі на падставе выкарыстаных дакументаў метрыкі ў сваёй грунтоўнай працы «Дзяржаўная гаспадарка Вялікага Княства Літоўскага пры Ягелонах» зрабіў падрабязны аналіз і стварыў дэталёвую карціну развіцця мытнай справы ў Вялікім Княстве ў XVI–XVII ст. [1]. Актыўна карыстаўся Літоўскай метрыкай ў сваіх працах В. Ю. Саяпін [2]. Пазначым, што і аўтар дадзенай публікацыі выкарыстоўваў факталагію Метрыкі ВКЛ у манаграфіі «Гісторыя Мінскай рэгіянальнай мытні» [3]. Але ніхто з гэтых даследчыкаў не закранаў асобна пытанне пра аналіз метрыкі ВКЛ як крыніцы па мытнай гісторыі. Такім чынам, актуальнасць і недаследаванасць узнятай праблемы, несумненна, мае высокі ўзровень навізны і патрабуе свайго асвятлення.

**Асноўная частка.** Метрыка з’яўляецца ўнікальным матэрыялам для вывучэння мытнай гісторыі Беларусі і дае магчымасць даведацца пра розныя старонкі мытнай справы ў ВКЛ. Кнігі Метрыкі сістэматычна вяліся з XV ст. Пазначым, што з XV па XVII ст. яе дакументы складаліся на старабеларускай мове, а з канца XVII – пачатку XVIII ст. – пераважна на польскай мове з вялікай доляй лацінскіх слоў. Таму, між іншым, вывучаючы метрыку, мы можам адначасова даследаваць і пытанне пра фарміраванне беларускамоўнай мытнай тэрміналогіі ў тыя часы. Сярод знаёмых на сённяшні дзень мытных адмысловых тэрмінаў: мытнікі, мыта і іншых, – мы сустракаем і тыя, якія настолькі зышлі ў «гістарычны цень», што не адразу і зразумелыя па сваім прафесійным сэнсе. Напрыклад, «прамыта» – кантрабанда, «адмычэнне» – вызваленне ад аплаты мыта, «квіт» – даведка пра аплату мыта, «лічба» – справаздача, «бязмытны ліст» – вызваленне ад уплаты мыта і іншае [4]. У гэтым сэнсе Літоўская метрыка можа стаць лексічным рэзервам для ўдасканальвання сучаснай беларускай мытнай тэрміналогіі.

Адразу падкрэслім, што час пачатку дзейнасці Мінскай мытні дакладна невядомы, але ўжо ў дарчым дакуменце 1387 г. вялікага князя Ягайлы свайму брату Скіргайлу зямель у цэнтральных і ўсходніх частках сучаснай Беларусі згадваецца «город Менеск весь и со всеми людьми и с землею … мытом и с доходом» [5, с. 285]. Несумненна, гэты запіс сведчыць пра наяўнасць так званага «менскага мыта» ў першыя дзесяцігоддзі знаходжання горада ў складзе ВКЛ. Але матэрыялы метрыкі дазваляюць нам даведацца пра пазнейшыя падзеі гісторыі мытні. Адна з найважнейшых – атрыманне ў 1499 г. Мінскам па прывілеі вялікага князя Аляксандра Ягелончыка «права майдэборскага» – Магдэбургскага права, якое дало гораду самакіраванне «через вряд добрый а справедливый» і магчымасць самастойна вырашаць пытанні свайго сацыяльна-эканамічнага развіцця. У прыватнасці, прывілеяй даравалася магчымасць накіравання ўзятага мыта з тавараў на патрэбы горада, дазвалялася ў «месте нашом мети важницу», а «теж мыто нашо Менское и с промытою мають мытники наши держати, которым колвек продадим, во впокои, подле давного обычаю» [6, с. 86–87]. Такім чынам, першыя дакументы Літоўскай метрыкі, у якіх маюцца звесткі пра «менскае мыта», датуюцца канцом XV ст.

Вельмі важна, што Метрыка захавала нам імя аднаго з найпершых мінскіх мытнікаў – Міхала Даніловіча, адкупшчыка «мыта менскага» ў 1489–1491 гг. У дакуменце чытаем: «Прадали есмо мыто меньское жыду троцкаму Михаилу Даниловичу на три годы за полосмаста коп грошей широких, на год па полтретяста коп грошей… А брати ему мыто по старому. Про то ж, штобы еси его од кривд боронил и не дал бы еси ему кривды чинити никому ни в чом и во всем бы еси мы ту нашому был помочон, абы ся мыто нашо не понижало» [7, с. 53–54].

Больш таго, метрыкальныя дакументы дазваляюць аднавіць спіс «менскіх мытнікаў» фактычна за стагоддзе з 1489 па 1584 гг.:

1. Даніловіч Міхаіл – адкупшчык мыта менскага ў 1489–1491 гг.
2. Працкевіч Ф., Сцяпановіч Яўлашка – адкупшчыкі мыта менскага ў 1495–1498 гг.
3. Янчалевіч Марцін – адкупшчык мыта менскага ў 1498–1500 гг.; 1504–1506 гг.
4. Ясковіч Нісан – адкупшчык мыта менскага ў 1501–1503 гг.; 1519–1520 гг.
5. Езафовіч Аўрам, Дзітрыховіч Ян – адкупшчыкі мыта менскага ў 1507–1509 гг.
6. Езафовіч Аўрам – адкупшчык мыта менскага ў 1509–1510 гг.
7. Даніловіч Шамак – адкупшчык мыта менскага ў 1510–1514 гг.
8. Ясковіч Нісан, Цуцыла Федка Андрэевіч – адкупшчыкі мыта менскага ў 1515–1518 гг.
10. Езафовіч Міхель – адкупшчык мыта менскага ў 1525–1527 гг.
11. Мошаевіч Ілля, Айзаковіч Пейсах, Галашкевіч Шахна – адкупшчыкі мыта менскага ў 1531–1534 гг.
12. Шалушыч Грынашка – менскі мытнік, гаспадарскі дваранін у 1536–1538 гг.
13. Сечка Фёдар Філіпавіч – менскі мытнік у 1549 г.
14. Бордзабагаты Іван, Бордзабагаты Аляхно – адкупшчыкі мыта менскага ў 1553–1556 гг.
15. Бародаўка Ізак – адкупшчык мыта менскага ў 1560–1562, 1565–1567 гг.
16. Сапега Мікалай – адкупшчык мыта менскага ў 1578–1581 гг.

17. Абрамовіч Хаім – адкупшчык мыта менскага ў 1582–1584 гг. [3].

Згодна з дакументамі метрыкі, статус мытнікаў быў вельмі высокі. Яны былі падсудныя толькі вялікаму князю літоўскаму, а бо як яго называлі ў метрыцы – «Гаспадару», ці падскарбію земскаму: «Мытников наших особ во всяких речах, буд купецъких и мытных, або и кривавых яко ся вышей поменило, не мает нихто з воевод, старост, державец, и з их наместников судити, одно мы, господар, або подскарбий наш земский» [8, с. 56].

Адначасова адным з ключавых патрабаванняў вялікакняскага кантракту было «трымаючы мыта і прамыту» не проста збіраць мытныя плацяжы, але і супрацьдзейнічаць кантрабадзе: «Верне справедливе бы есте нам служили и пожытку нашого з великою пильностью на тых мытех стерегли, никому не фолкгуючы так, как быхмо ни в чом шкоды не мели, а на местцы одном не лежали, але мыта объеждчали и коло них великую сторожу, опатреность и чуйность мели» [3, с. 19].

У дакументах канцылярыі вялікага князя Аляксандра Ягелончыка захаваўся кантракт на арэнду Мінскага мыта, выдадзены Федцы Процкевічу і Яўлашцы Сцёпановічу 13 мая 1495 г. Ён дазваляе нам зразумець падставы, згодна з якімі прадстаўлялася жадаючым арэнда мыта «Менского» – «Продалиесмо мыто Менское мещаном Менским, Федку Процкевичу а Евлашку Степановичу, на три годы. На год мают нам давати по сту коп и по двадцати коп грошей широких. А рок мают увезатися в тое мыто перед сею прийдучою семою суботою за три недели. А держати мают тое мыто три годы до тогож року. А мают нам дават и на кождый год по сту коп и по двадцати коп грошей, на рок, в трех неделях перед семою суботою. Первый год выдержавши, мают нам дати сто коп грошей и двадцат коп грошей; а на другий год по томуж мают давати; а на третий год таке ж мают давати нам сто коп и двадцат коп грошей, выдержавши остаточный год. А мают нам давати все готовыми грошми.

А мы на квитацыях в них не маем ником удавати с того нащого с мыта. Вси тыи гроши мают нам готовыми грошми давати в наш скарб на тыи роки, верху выписаныи. Ино штобы еси у мыто нашо и у промыту не вступался. Нехай бы они, мытники наши, мыто и промыту заведали по давному, штобы еси от кривд их боронил, и во в сем бы еси мыту нащому был помочон, абы мыто нашо не понижалося, и штобы еси их судил, ани рядил, а и наместник бы твой еж их не судил, ани рядил, и децких бы еси своих на них не давал, а и наместник бы твое теж на них децких своих не давал. Кому бы до них было дело, и мы маем о том межи ними смотрети в тот час, поки выдержат мыто нашо» [8, с. 27].

У іншым арэндным лісце ад 7 верасня 1565 г., напісаным у Городне пісарам Астафеем Валовічам Давыду Шмерлевічу, Ізаку Барадавце і Аўраму Длугачу з нагоды трымання імі новых мыт Подляшскіх, Менскай і Віленскай мытных камор, мы можам даведацца і пра мытныя тэхналогіі таго часу, якія існавалі як у Мінскай мытні, так і па ўсёй тэрыторыі ВКЛ. Сабраныя мыты яны мусілі падаваць у скарб два разы на год – на дзень святых апосталаў Пятра і Паўла, а другую «половіцу пенезей на новое лето». Але, калі б праз «вторгненьне неприятелское до панства нашого Великага Княэьства Литовского котораго часу пришло, або голод, албо поветрее з воли Божьи замножилося», то мытнікі павінны былі скласці справаздачу-лічбу: па якой прычыне і колькі не сабралі мыта ў скарб і ім будзе даравана нявыплата. Адносна прамыта ў лісце было сурова пазначана: «А хто бы ся промытил и прокрадши ся через комору мытную, мыта звычайного не заплатил, таковые купцы везде мають быти гамованы и промычываны подле давное звыклости, которое промыты з ведомости врадов наших, где бы ся промыта притрфила, мають на нас, господара, половицу давати, а собе брати другую половицу» [8, с. 50].

У лістах на арэнду часта фігураваў тэрмін «бязмытны ліст» – вызваленне купца паводле загаду Гаспадара ад платы мыта за правоз уласнага тавару. Так, у Грамаце караля Казіміра IV Андрэя Ягелона ад 5 мая 1480 г. адзначалася аб дазволе мінскаму купцу Церашковічу «бязмытнага гандлю ў гарадах Вялікага Княства Літоўскага»: «тот наш чоловек, мещание менский Лука Терешкович, торгует нашим дубасом бобруйским троцкое половины и нашими пенязьми; а от того нам прибытку дает. И вы бы от нашого дубаса и от его комяги мыта не брали бы… по всим нашим мытом, и по князским, и по панским, и по боярским, сухим и водою. А которыи бы хотели через наш лист силу ему чинити, а мыто взяли от нашого дубаса и от его комяг, то нам великую вину заплатит» [9, с. 261].

«Мытныя дакументы» метрыкі ВКЛ настолькі разнастайныя па сваім змесце, што даюць нам дадатковыя звесткі нават па іншых галінах жыцця ў княстве і пра самых розных персаналіях. Так, толькі у адным дакуменце «лісце» ад 24 красавіка 1486 г. мы можам убачыць шматлікія прозвішчы вялікакняскіх крэдытораў, якім мытнікі мусілі аддаць з набранага мыта гаспадарскія пазыкі: «Ходьку Могилевцу 8 коп грошей с мыта меньского ... Богдану Цьковичу 6 коп грошей с мыта меньского … Писару Петрашку 10 коп грошей с мыта меньского. Ивану 6 коп с мыта меньского. Андрушку Коптю 7 локоть сукна махальского с мыта меньского. Федку

Колонтаеву 7 локотъ сукна махальского с мыта меньского…» [7, с. 33–35].

З дакументаў метрыкі мы можам даведацца, што часам багатая Мінская мытная камора не давала ў скарб аніякага мыта. Прычынамі падобнага станавіліся разбуральныя войны. Так было напачатку XVI ст.: у 1505 г. горад быў узяты штурмам крымскімі татарамі, цалкам разрабаваны і спалены. Пасля зноў было неаднаразовае спусташэнне яго ваколіц, ужо не кажучы пра пастаянныя ваенныя дзеянні на ўсходніх межах ВКЛ, а стыхійныя бедствы-пажары і эпідэміі не раз пазбаўлялі горад асноўнай крыніцы даходаў ад транзітнага гандлю. Разумеючы гэта і жадаючы дапамагчы аднаўленню дабрабыту, вялікі князь літоўскі Жыгімонт Стары 27 кастрычніка 1547 г. у сваім «лісце» «мещаном Менским, которых дома в месте Менском погорели, на десет год волности… Не мають они в тую десеть год никоторых подачок нам до скарбу нашого давати, так теж и от товаров своих, которыми бы они купчили, мыта не мають на мытех наших и князьских, и паньскихъ, и духовных, сухим путем и водою, платити. Але мають безмытне торговати, поки олиж тая десет год выйдеть» [8, с. 40].

**Заключэнне.** Такім чынам, Метрыка Вялікага Княства Літоўскага, нягледзячы на пэўную некамплектнасць дакументаў, з'яўляецца найбагацейшым зборам факталагічнага матарыялу па гісторыі Мінскай мытні. Яе дакументы раскрываюць разнастайныя старонкі дзейнасці гэтай ўстановы ў XV–XVI стст. З яе дапамогай мы можам даведацца пра персанальнае кіраўніцтва мытні, правілы і тэхналогіі працы мытнікаў, пра розныя кшталты мыта, змаганне з прамытам, тагачасную мытную тэрміналогію. Метрыка ВКЛ, як ніякая іншая крыніца, дазваляе аднавіць малавядомую і забытую мытную старонку сённяшняй сталіцы Беларусі.

## Спіс літаратуры

1. Доўнар-Запольскі М. В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах. Мінск: Беларус. навука, 2009. 758 с.

2. Саяпин В. Ю. Таможенная служба. В 2 кн. Кн. 1. Мыто и мытники. Гродно: Гродней. тип., 2005. 400 с.

3. Острога В. А., Иванов С. В. История Минской региональной таможни. Минск: РИВШ, 2022. 172 с.

4. Острога В. А. Специальная таможенная терминология Великого княжества Литовского XVI–XVIII вв. // Беларусь в современном мире: материалы VIII Междунар. конф., посвященной 88-летию образования Белорусского государственного университета, Минск, 30 октября 2009 г. Минск, 2009. С. 241–242.

5. Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя: у 2 т. Мінск: БелЭН, 2006. Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд) [і інш.]. 792 с.

6. Прывілей Менску на Магдэбургскае права 1499 года. Літоўская Метрыка. VI // Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею. URL: http://mensk.by/modules.php?name=Articles& pa=showarticle&articles_id=89 (дата обращения: 15.01.2023).

7. Lietuvos Metrika – Lithuanian Metrica – Metryka Litewska. Knyga Nr. 4 (1479–1491); Užrašymų knyga 4 / Lietuvos istorijos institutas. Vilnius: Žara, 2004. 285 p.

8. Беларускі архіў. Т. 3. Менскія акты. Выпуск першы. XV–XVIII стст. Менск: Выд-ва БАН, 1930. 398 с.

9. Белоруссия в эпоху феодализма. Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1959. Т. 1. 515 с.

## References

1. Doўnar-Zapol'ski M. V. *Dzyarzhaynaya gaspadarka Vyalikaga knyastva Litouskaga pry Yagelonakh* [Dzyarzha'naya gaspadarka of Vyalikaga of the principality of Lithuanian pr Jagielonah]. Minsk, Belarus. navuka Publ., 2009. 758 p. (In Belarusian).

2. Sayapin V. Yu. *Tamozhennaya sluzhba. V 2 kn. Kn. 1. Myto i mytniki* [Customs service. In 2 books. Book 1. Myto and mytniki]. Grodno, Grodnen. tip. Publ., 2005. 400 p. (In Russian).

3. Ostroga V. A., Ivanov S. V. *Istoriya Minskoy regional'noy tamozhni* [History of Minsk Regional Customs]. Minsk, RIVSh Publ., 2022. 172 p. (In Russian).

4. Ostroga V. A. Special customs terminology of the Grand Duchy of Lithuania in the XVIth–XVIIIth centuries. *Belarus' v sovremennom mire*: *Materialy VIII Mezhdunar. konf., posvyashchennoy 88-letiyu obrazovaniya Belorusskogo gosudarstvennogo universiteta* [Belarus in the Modern World: Materials of the VIII Intern. conf. dedicated to the 88th anniversary of the Belarusian State University]. Minsk, 2009, pp. 241–242 (In Russian).

5. Pashkou G. P. *Vyalikaye knyastva Litouskaye: entsyklapedyya. U 2 t. T. 2. Kadetski korpus – Yatskevich* [The Vyalikae Principality of Lithuania: encyclopaedi. In 2 vols. Vol. 2. Academic Corps – Yatskevich]. Minsk, BelEN Publ., 2006. 792 p. (In Belarusian).

6. Privat Menska on the Magdeburg rights of 1499. Lithuanian Metryka. VI. *Acts relating to the history of Western Russia, collected and published by the Archaeographic Commission*. Available at: http://mensk.by/modules.php?name=Articles& pa=showarticle&articles_id=89 (accessed 15.01.2023).

7. *Litovskaya Metrika – Metrika Litovskaya. Nomer knigi 4 (147 –1491); Bloknot 4* [Lithuanian Metrica – Metryka Litewska. Book no. 4 (1479–1491); Notebook 4]. Vil'nyus, 2004. 285 p. (In Lithuanian).

8. *Belaruski arkhiu. T. 3. Menskiya akty. Vypusk pershy. XV–XVIII stst.* [Belarusian archives. T. 3. Menskiya acts. First edition. 15–18 centuries]. Mensk, Vyd-va. BAN Publ., 1930. 398 p. (In Belarusian).

9. *Belorussiya v epokhu feodalizma* [Belarus in the era of feudalism]. Minsk, Izd-vo. Akad. nauk BSSR Publ., 1959. T. 1. 515 p. (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Астрога Віктар Аляксандравіч –** доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры мытнай справы. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (пр-т. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь). E-mail: ostroga.v@mail.ru

## Information about the author

**Astroha Victor Alexandrovich** – DSc (History), Professor, head of the Department of Customs Affairs. Belarusian State University (4, Nezalezhnastsi Ave., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: ostroga.v@mail.ru

*Паступіў 10.03.2023*